**Прафсаюзны праект "Настаўніцтва: навігатары поспеху" з кожным годам становіцца ўсё больш маштабным. Мяняюцца адрасы яго рэалізацыі, павышаецца творчая актыўнасць і ініцыятыўнасць педагагічных калектываў. Штомесяц у сталіцы праводзяцца шматлікія мерапрыемствы для пачынаючых настаўнікаў і тых, хто ўжо мае вялікі вопыт, але гатовы ўвесь час развівацца побач з маладымі і крэатыўнымі калегамі. Арганізатар праекта — Мінская гарадская арганізацыя Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.**

# Вучымся разам

Кіраўнік мінскай арганізацыі прафсаюза Ларыса Волкава адзначае, што настаўніцтва з'яўляецца сістэмным, мэтанакіраваным рухам з жывымі зносінамі паміж педагогамі, калі энергія маладосці ўзаемадзейнічае з дарослай мудрасцю і вопытам. Такое творчае супрацоўніцтва ўмацоўваецца падчас майстар-класаў, семінараў, канферэнцый, трэнінгаў, лекцый, інтэлектуальных і дзелавых гульняў "Калі мы разам!".

Пройдземся па маршрутах настаўніцтва і адчуем, наколькі важна для нашых педагогаў раскрыць свае таленты, даведаемся, якія методыкі прапаноўваюць для гэтага настаўнікі.

— Першы крок у прафесіі вельмі важны і адказны, — расказвае Аксана Кульніс, загадчыца дзіцячага сада № 250 Мінска. — Маладыя спецыялісты маюць патрэбу ў падтрымцы. Таму неабходна не толькі дзяліцца сваімі напрацоўкамі, але і ствараць камфортнае асяроддзе, у якім пачынаючы педагог можа спакойна і ўпэўнена развівацца, абапіраючыся на вопыт калег.

На праектнай пляцоўцы дзіцячага сада правялі майстар-класы па развіцці камунікатыўных здольнасцей выхаванцаў дашкольнага ўзросту праз выкарыстанне дыдактычных дапаможнікаў, стварэнне адукацыйнага асяроддзя, якое садзейнічае рознабаковаму развіццю асобы дзіцяці. Праект "Настаўніцтва: навігатары поспеху" дазваляе сістэматызаваць назапашаны вопыт, рабіць яго больш даступным і эфектыўным для тых, хто толькі пачынае працаваць. Як сцвярджае А.Кульніс, такія напрамкі прафесійнага супрацоўніцтва дазваляюць ствараць адзіную адукацыйную прастору, накіраваную на павышэнне якасці дашкольнай адукацыі і ўвогуле адукацыйнай галіны.



# Аднаго поля ягады

Кацярына Алексяюк, настаўніца англійскай мовы гімназіі № 35 Мінска імя Я.І.Міркоўскага, сумесна з маладой настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Юліяй Патоцкай распрацавалі і правялі майстар-клас на тэму "Аднаго поля ягады: ад міжпрадметных сувязей да метапрадметнага выніку" на прыкладзе вывучэння вучэбных прадметаў "Беларуская мова", "Беларуская літаратура" і "Англійская мова". Прадстаўленыя прыёмы даюць магчымасць фарміраваць і развіваць метапрадметныя кампетэнцыі дзяцей пры вывучэнні аднаго прадмета праз прымяненне ведаў, атрыманых пры вывучэнні другога прадмета.

Як адзначае Кацярына Алексяюк, пастаўленае перад удзельнікамі майстар-класа праблемнае пытанне "Ці сапраўды міжпрадметнасць і метапрадметнасць — аднаго поля ягады?" заахвоціла іх да пошукавай дзейнасці. У працэсе параўнання гэтых паняццяў была зроблена выснова, што яны напрамую звязаны адно з адным, паколькі міжпрадметныя сувязі спрыяюць фарміраванню метапрадметных вынікаў. Прапанаваныя на майстар-класе прадметы маюць агульныя ідэі, якія развіваюць пазнавальную актыўнасць праз супастаўленне культур, камунікатыўную кампетэнцыю, рэгулятыўныя навыкі (планаванне, рэфлексія, самаацэнка і г.д.), фарміруюць асобасную і грамадзянскую пазіцыю навучэнцаў праз міжкультурны дыялог. Удзельнікі практыкаваліся ў прымяненні розных прыёмаў, накіраваных на развіццё метапрадметных кампетэнцый.

Для фарміравання пазнавальных кампетэнцый быў прапанаваны прыём "Скрыжаванні", для развіцця камунікатыўных кампетэнцый — прыём "Метафара". Навыкі мэтавызначэння, планавання сваёй дзейнасці, выбару аптымальных сродкаў навучання было прапанавана развіваць з дапамогай прыёму "Ліфтавая прэзентацыя".

— Для правядзення асобаснай рэфлексіі мы прапануем настаўнікам запоўніць "Рэфлексіўную карту", — расказвае Кацярына Алексяюк. — У ёй змешчаны пытанні, якія тычацца прафесійнага росту і асобасных вынікаў іх дзейнасці. Напрыклад, "Што стала для вас нечаканым адкрыццём?", "Калі прыйшло натхненне, кампетэнцыя, якую вы развівалі на майстар-класе?", "Як вы можаце прымяніць яе на практыцы?", "Калі міжпрадметнасць была б вобразам, то яна стала б…". На этапе рэфлексіі падобны прыём дапамагае ўсвядоміць значнасць сваёй работы, вызначыць напрамак далейшага развіцця.

Педагогі адзначалі, што прыёмы і формы работы, якія былі прадстаўлены на майстар-класе, могуць прымяняцца не толькі пры вывучэнні англійскай мовы, беларускай мовы і літаратуры. Пункты перасячэння лёгка можна знайсці ў самых, здавалася б, аддаленых прадметах і выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі для дасягнення метапрадметных вынікаў, а значыць, для ўстойлівага асобаснага развіцця навучэнца.



# Канструктар сучаснага ўрока

На метадычным майстар-класе ў сярэдняй школе № 210 разглядалася праектаванне эфектыўных вучэбных заняткаў на аснове "Канструктара сучаснага ўрока" — інструмента, які здольны аптымізаваць дзейнасць настаўніка, зрабіць працэс яго падрыхтоўкі да заняткаў больш творчым і менш працаёмкім. Святлана Бокач, настаўнік-метадыст, адзначае, што мэць такі канструктар для правядзення ўрока вельмі важна. Ён дапамагае ў падрыхтоўцы якасных, цікавых і тэхналагічных заняткаў, якія адпавядаюць адукацыйным стандартам і развіваюць неабходныя кампетэнцыі навучэнцаў. Пры гэтым асаблівая ўвага ўдзяляецца стварэнню алгарытму ўрока, які ўключае выбар тэмы, мэты і праблемнай сітуацыі. На практыцы ўдзельнікі майстар-класа выкарыстоўвалі прапанаваны інструментарый, самастойна праектавалі кожны этап урока, напаўняючы яго канкрэтнымі прыёмамі.

Так, напрыклад, для так званага эмацыянальнага ўваходжання ва ўрок і актывізацыі ўвагі навучэнцаў педагогі выбіралі такія прыёмы, як "Анаграма", "Фантастычная дабаўка", "Здзіўляй", гульню "Ці верыце вы, што…". Каб актуалізаваць веды, удзельнікі сустрэчы выкарыстоўвалі прыёмы "Мазгавы штурм", "Кошык ідэй", "Лаві памылку!", "Сляпы тэкст", якія дазваляюць эфектыўна паўтарыць матэрыял і павысіць актыўнасць навучэнцаў.

Акрамя таго, педагогі выкарыстоўвалі візуальныя інструменты — "Фішбоўн", "Дыяграма Венна", "ПОПС-формула" і інш. На завяршэнне ўрока выкарыстоўваліся прыёмы "Чамадан", "Тэлеграма" і інш. Па меркаванні ўдзельнікаў майстар-класа, канструктар дапамагае не проста правесці заняткі, а сфарміраваць у вучняў асобасныя і метапрадметныя якасці, развівае ў іх уменні аналізаваць, параўноўваць і рабіць высновы. Па сутнасці, такі інструментарый — гатовы алгарытм, які дазваляе ператварыць праектаванне кожнага ўрока ў эфектыўны і захапляльны працэс.

# Музей і "ПрафСтарт"

У сталічнай гімназіі № 28 імя Уладзіміра Караткевіча выбралі актуальную тэму для правядзення ўрока ў музеі. Па словах дырэктара гімназіі Алесі Зяневіч, удзельнікі сустрэчы былі пагружаны ў рэальнае музейнае асяроддзе, якое створана ў гімназічнай галерэі Уладзіміра Караткевіча, у зоне экспазіцыі "Зямля пад белымі крыламі", рэкрэацыі з фрэскамі па творах пісьменніка, фотаэкспазіцыі "Беларуская вёска". Настаўнікі абмеркавалі алгарытм правядзення ўрока ў музеі, яго метадычныя аспекты, вызначылі рызыкі, а пасля на прыкладзе тэмы па беларускай літаратуры паспрабавалі яго арганізаваць. Для эфектыўнага засваення прадметнага матэрыялу на ўроку ў музеі была прапанавана квест-экскурсія з распрацаванай квест-старонкай з заданнямі. Выбраная тэма дазволіла удзельнікам у інтэрактыўным віртуальным фармаце здзейсніць падарожжа па шматлікіх музеях Мінска і ўзяць многія прыёмы сабе на заметку.

У гімназіі № 22 прайшло пасяджэнне метадычнай студыі "ПрафСтарт" па тэме "Кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні як сродак фарміравання функцыянальнай адукаванасці вучняў". На пасяджэнне сабралася як моладзь, так і вопытныя настаўнікі. Адным са спікераў мерапрыемства выступіла Наталля Дубіна, настаўніца, ветэран педагагічнай працы, уладальнік прэміі Мінгарвыканкама. Яна на заслужаным адпачынку, але з радасцю перадае свой вопыт маладым. Удзельнікі сустрэчы мелі магчымасць паэксперыментаваць з сучаснымі тэхнікамі, новымі тэхналогіямі і падыходамі і тым самым папоўніць свой прафесійны багаж.

— Прыкладаў супрацоўніцтва настаўнікаў у рэалізацыі праекта "Настаўніцтва: навігатары поспеху" сёння ўжо не злічыць, — гаворыць ідэйны натхняльнік праекта і маладзёжнага савета Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ала Канаплёва. — Педагагічны тандэм "Вопытны настаўнік — малады педагог" ад дуэта пераходзіць на ўзровень цэлай каманды, дзе творчае ўзаемадзеянне двух пакаленняў адкрывае новыя перспектывы ва ўдасканаленні педагагічнай працы і становіцца крыніцай новых прафесійных знаходак. Галоўныя вынікі настаўніцкага руху — адзінства памкненняў, дыялог пакаленняў, у час якога нараджаюцца самыя крэатыўныя і эфектыўныя рашэнні. Праект "Настаўніцтва: навігатары поспеху" наглядна паказвае, што прафсаюз стварае рэальныя магчымасці для росту і развіцця прафесійнага майстэрства педагогаў.

**Ала КЛЮЙКО.**